***В. М. Белакурскі,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры філасофіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*Культур ыі мастацтваў*

***Ж. Я. Белакурская,***
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДУХОЎНАСЦЬ І РОДНАЯ МОВА

Праблема духоўнасці – адна з самых актуальных праблем нашага часу, адна з найгалоўнейшых для чалавека, сям’і, грамадзянскіх інстытутаў, дзяржавы і чалавецтва ў цэлым. У гісторыі трох братніх усходнеславянскіх народаў яна была цесна звязана з Царквой. З часоў Кіеўскай Русі духоўным выхавальнікам усходніх славян з’яўлялася Візантыя. Менавіта адтуль на нашы землі прыйшло евангельскае «У пачатку было Слова, і Слова было да Бога, і Слова было Бог» (Ін. 1:1). Евангелле ад Іаана выдзяляецца з ліку ўсіх біблейскіх кніг мноствам рэлігійна-філасофскіх паняццяў і катэгорый. Праз царкоўна-славянскі пераклад гэтага Евангелля, зроблены Кірылам і Мяфодзіем, у славянскія мовы ўвайшлі такія паняцці, як «асветніцтва», «ісціна», «жыццё», «вера», «веды», «слава», «улада», «вечнасць».

Свяціцель Феафан Затворнік першым у сваім творы «Душа – карысныя павучэнні» щвёў ва ўжытак высокае паняцце духоўнасці, утворанае ад такога ж высокага паняцця Дух. Паводле вучэння апостала Паўла, духоўны – гэта той, у якім дзейнічае Святы Дух, тады як душэўны – чалавек, у якога ёсць душа і цела, але ён яшчэ не дасягнуў Святога Духа, які дае жыццё душы.

Як вядома кожнаму хрысціяніну, дух чалавека дзейнічае праз слова, увасабляецца словам і жыве ў ім. Таму праблема духоўнай значнасці слова, яго цеснай сувязі з асобай, з характарам і лёсам народа, з вышэйшай духоўнай сферай набывае сёння для нас асаблівую актуальнасць. Выступаючы шматслойнымі адзінкамі сэнсу, квантамі розуму, словы як сутнасці спасцігаюцца толькі чалавекам, бо яны «продолжение сути и одежда духа его».

Сённяшні навуковы падыход да феноменаў «духоўнасць» і «родная мова» сустракае пэўныя цяжкасці, звязаныя з тым, што

дагэтуль адсутнічаюць выверaныя і несупярэчлівыя паняцці, а таксама адпаведным чынам распрацаваны паняццёва-тэрміналагічны апарат. Паняцце «духоўнасць» у сучаснай моўнай свядомасці мае падвойны сэнс, таму што ў разуменні паняцця духоўнасці гістарычна сфарміраваліся рэлігійны і секулярны кірункі. Хрысціянскае разуменне духоўнага, як вядома, прадугледжвае імкненне чалавека да Святога Духа (у чым заключаны першапачатковы рэлігійны сэнс дадзенага тэрміна). У секулярным светапоглядзе катэгорыя духоўнасці выкарыстоўваецца ў некалькіх значэннях: 1) нешта незвычайнае, узвышанае, вечнае, супрацьлеглае паўсядзённаму матэрыяльнаму свету рэчаў; 2) імкненне чалавека ўзвысіцца над пачуццёвымі задавальненнямі; 3) маральна-эстэтычныя, экзістэнцыяльныя пачаткі ў чалавеку.

У паслякастрычніцкі перыяд на тэрыторыі Беларусі, як і ў іншых савецкіх рэспубліках, адбылася рэзкая змена культурных парадыгмаў. Новая пралетарская атэістычная культура супрацьпаставіла сябе ўсходне-хрысціянскай метакультуры. «Пры гэтым назіралася своеасаблівая сакралізацыя грамадска-палітычных паняццяў і тэрмінаў. Асабліва праявілася дадзеная тэндэнцыя пры перакладзе на беларускую мову твораў «класікаў» марксізму-ленінізму» [3, с. 129]. У выніку традыцыйныя духоўна-маральныя канцэпты шматвяковай беларускай культуры, якія мелі праваслаўныя карані, сталі неактуальнымі. У беларускай мове пачалі дастаткова актыўна функцыянаваць іншыя канцэпты. Традыцыйная лексіка ўсё больш абрастала чужымі для яе ідэалагічнымі канатацыямі, а хрысціянская лексіка архаізавалася, адыходзячы на перыферыю моўнай сістэмы.

Першапачаткова хрысціянская духоўнасць была неаддзельнай ад маралі, што станоўча ўплывала ў нашай гісторыі на фарміраванне беларускага лінгвакультурнага поля «духоўнасць». У савецкі час рэлігійныя канцэпты актыўна выцясняліся з грамадскай свядомасці і, як вынік, фактычна адбылася падмена духоўнасці маральнасцю. Духоўна-маральная лексіка, па сутнасці, стала заяўляць аб сабе як безрэлігійная. Тым не менш хрысціянская духоўнасць «не была згублена пад уплывам ні прымусовых, ні натуральных асімілятыўных працэсаў толькі дзякуючы таму, што самі народныя масы трымаліся сваіх гістарычных каранёў, развівалі, як маглі, сваю духоўную спадчыну, свядома імкнуліся ад пакалення да пакалення размаўляць на мове бацькоў» [1, с. 25].

У 90-я гг. XX ст. таталітарная сістэма разбураецца, у чарговы раз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выклікаючы ў Беларусі змену культурных парадыгмаў. З аднаго боку, у грамадства вяртаецца традыцыйная беларуская культура з яе хрысціянскай асновай, з другога – адбываецца ўключэнне ў яе заходніх ідэалаў пад лозунгамі дэмакратызацыі грамадства і амерыканізацыі культуры.

Пасля доўгіх дзесяцігоддзяў атэізму рэлігійная свядомасць уваходзіць у сучаснае жыццё беларускага грамадства, аднаўляючы адпаведныя ментальныя і моўныя адзінкі. Разам з атрыбутамі і традыцыямі праваслаўя, а таксама іх намінацыямі ў моўнай карціне свету беларуса назіраецца пэўная тэндэнцыя да «рэстаўрацыі» лінгвакультурнага поля «духоўнасць» і яго асноўных кампанентаў з хрысціянскім каштоўнасным напаўненнем. Духоўнасць і маральнасць зноў імкнуцца да аб'яднання ў адным лінгвакультурным полі, актуалізуючы сёння своеасаблівую пераходную адзінку «духоўна-маральны».

Аналіз сучаснага стану духоўна-маральных канцэптаў у канфесійным і свецкім дыскурсах паказвае, што на структуру і змест лінгвакультурнага поля «духоўнасць» аказваюць свой уплыў інтэнцыі і аксіялагічныя ўстаноўкі дадзеных дыскурсаў, якія мадэлююць гэтае поле і яго канцэпты ў адпаведнасці з іх камунікатыўнымі мэтамі і задачамі.

Зараз у нашым грамадстве і яго культуры працягваецца працэс аднаўлення праваслаўнай духоўнасці, аднаўленне канцэптаў, якія яе менталізуюцца. У большай ступені гэты працэс актывізаваўся ў навуковым дыскурсе (канферэнцыі, чытанні аб духоўных каштоўнасцях), праваслаўна-культурным дыскурсе і г. д. Такім чынам, сёння поле «духоўнасць» паўстае перад намі дастаткова дынамічным; змены канцэптаў, а таксама іх кампазіцыі вызначаюцца менавіта грамадска-культурнымі абставінамі: зменай грамадскіх адносін і культурных парадыгмаў у соцыуме, наяўнасцю ў ім розных культур (праваслаўнай, свецкай), да якіх адносяць і з якімі ідэнтыфікуюць сябе члены грамадства.

Вывучэнне феномена духоўнасці – задача складаная і шматпланавая, паколькі ў гістарычным часе народы заяўляюць аб сабе адметнай сістэмай традыцый, ідэалаў, пэўным характарам, культурай і пастаянна вызначаюць сваю ролю і становішча да іншых народаў, мы можам весці размову аб нацыянальнай духоўнасці [2, с. 183–184]. На наш погляд, яна праяўляецца ў мове народа, яго нацыянальнай самасвядомасці і нацыянальным характары, рэлігійнай веры, культуры наогул. Семантычны аналіз духоўнай культуры беларусаў дазваляе нам адзначыць асаблівасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальна-адметнага мыслення беларуса, зафіксаваць на вярбальным узроўні спецыфіку яго ментальнага свету і нацыянальнага характару, а таксама прасачыць магчымыя відазмяненні ў свядомасці чалавека, звязаныя з сучаснымі глабальнымі працэсамі, якія адбываюцца ў свеце.

Нацыянальная духоўнасць знаходзіцца ў стане перманентнага развіцця і ў кожную гістарычную эпоху набывае свой вобраз, прычым усе гэтыя вобразы абавязкова маюць агульную сутнасную аснову. Сёння вывучэнне ў Рэспубліцы Беларусь нацыянальнай духоўнасці набывае асаблівую актуальнасць і патрабуе ўсебаковага аналізу нацыянальных ідэалаў і каштоўнасцей, асаблівасцей нацыянальнага характару, а таксама адлюстравання гэтага ў роднай мове. Менавіта тады ў свядомасці сучаснага індывіда Дух паўстане «рэальным», а духоўная культура, у якой ён абуджаецца да самасвядомасці, заявіць аб сабе як мэтанакіраванае і адказнае мысленне родных яму па Духу папярэдніх пакаленняў беларусаў.

1. *Лыч, Л.* Беларуская нацыя і мова / Л. Лыч. – Мінск, 1994. – С. 25.

2. *Ортега-и-Гассет, Х.* Этюды об Испании / Х. Ортега-и-Гассет. – Киев, 1994. – 317 с.

3. *Цыхун, Г.* Дэфармацыя беларускай літаратурнай мовы ў гады таталітарызму / Г. Цыхун // Выбраныя працы: беларусістыка, славістыка, арэальная лінгвістыка. – Мінск, 2012. – 372 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ